11. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 2.
12. НАРБ. – Ф. 1350. Оп. 1.
13. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 21.
14. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 4.
15. НАРБ. – Ф. 1450. Оп. 3.
16. *Кулинок, С. В.* Деятельность немецких разведывательно-диверсионных школ и курсов на территории Беларуси в годы Великой Отечественной войны: новые направления и перспективы исследования / С. В. Кулинок // Российские и славянские исследования: сб. науч. тр.– Минск : БГУ, 2016. – Вып. 11. – С. 85–91.
17. НАРБ. – Ф. 4п. Оп. 33а.
18. НАРБ. – Ф. 1440. Оп. 3.
19. НАРБ. – Ф. 1406. Оп. 1.
20. *Кулинок, С. В.* Агенты в юбках / С. В. Кулинок // Беларуская думка. – 2014. – № 11. – С. 82–90.
21. *Кулинок, С. В.* Дети-диверсанты немецких спецслужб / С. В. Кулинок // Беларуская думка. – 2015. – № 10. – С. 80–86.

**С. Я. Новікаў**

## ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ (1941–1944): НАЙНОЎШЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ГЕРМАНСКАЙ ВАЕННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Прадметам нашага даследавання з’яўляюцца асноўныя ідэі і накірункі развіцця сучаснай германскай ваеннай гістарыяграфіі, фарміраванне якой цягам двух апошніх дзесяцігоддзяў адбывалася пад уплывам *культурнага павароту* [1, S. 247]. Уплыў апошняга на гістарычную навуку Германіі прывёў не толькі да паспяховага збліжэння пазнавальных сфер з гісторыі, грамадства і культуры, але і да рашучага пошуку новых аб’ектаў даследавання з выкарыстаннем нетрадыцыйных метадалагічных прынцыпаў, у большай ступені характэрных для сферы грамадскіх навук, якія ў сваю чаргу знайшлі шырокі ўжытак у гістарычных працах другой паловы 1990-х і нулявых гадоў, а таксама яскрава сведчылі аб адкрыцці доступу да новых ведаў у дачыненні да добра вядомай тэмы гісторыі нацыянал-сацыялізму ў гады Другой сусветнай вайны. На аснове новых архіўных дакументаў стала магчымым вырашыць галоўную пошукавую задачу – не толькі рэканструяваць гістарычную лагісціку нацысцкіх злачынстваў у еўрапейскім маштабе, але і паказаць іх наступствы ў арыгінальным вымярэнні, спалучаючы эканамічную, ваенную і расавую геастратэгію, з аднаго боку, а з другога – раскрываючы характар ваеннай паўсядзённасці і трагічныя наступствы нацысцкай акупацыі для грамадзянскага насельніцтва на прыкладзе розных рэгіёнаў Еўропы, у тым ліку Беларусі [1, S. 249]. Такім чынам, вынікам «культуралагічнага звароту» з’явілася ўмацаванне агульнай тэндэнцыі да

«*неабходнасці даследавання ваеннай гісторыі не столькі як выключна баявых аперацый, колькі вайны ў самым розным – міжнародным, унутрыпалітычным, эканамічным і грамадскім кантэксце*» [2, S. 5].

Адбор прац у артыкуле праведзены на аснове крытэрыю навуковай навізны, увядзення новых дакументальных крыніц і атрымання на іх аснове актуальных гістарычных ведаў, адлюстраваных у грунтоўных даследаваннях (акцэнт рабіўся выключна на апублікаваныя манаграфічныя працы) нямецкіх гісторыкаў [4; 5; 6; 7; 8; 9; 10; 11; 12; 13; 14; 15; 16; 17; 18; 19; 20; 21; 22; 23; 24; 25; 26; 27; 28; 29; 30; 31]. Аналіз вынікаў развіцця германскай гістарыяграфіі сведчыць не толькі аб устойлівай тэндэнцыі росту колькасці, але і фарміраванні новых даследчыцкіх кірункаў па вывучэнні ваеннай гісторыі Беларусі, сярод якіх на цяперашні час найбольш адметнымі з'яўляюцца гісторыя баявых дзеянняў (Х. Ганцар, Х. Герлах, Д. Поль, К.-Г. Фрызер, Х. Хартман), акупацыі (К. Й. Арнольд, А. Бракель, Х. Герлах, Б. К'яры, Д. Поль), эканамічнай палітыкі (Герлах), палітыкі вынішчэння (Х. Герлах, Б. К'яры, П. Коль, Б. Квінкерт), ідэалагічнага супрацьстаяння (Х. Герлах, Б. К'яры, Б. Квінкерт, А. Бракель, М. Бартушка, С. Бурмістр), генацыду мясцовага і яўрэйскага насельніцтва (Д. Поль, Х. Герлах, Б. К'яры, П. Коль, Б. Бракель), праяў калабарацыі (Б. К'яры, Х. Герлах, А. Бракель), супраціўлення савецкіх партызан і падпольшчыкаў (Х. Герлах, Б. Мусял, М. Бартушка), тэмы штодзённасці ў акупаваным грамадстве (Б. К'яры, А. Бракель, Б. Квінкерт), прымусовай працы (Х. Герлах, Д. Поль, А. Бракель), лёсу савецкіх ваеннапалонных (К. Й. Арнольд, Х. Герлах, Д. Поль). У ходзе аналізу найноўшых даследаванняў германскай гістарыяграфіі аўтар імкнуўся абазначыць тыя яе накірункі, дзе бясспрэчным гістарыяграфічным фактам сталі значныя дасягненні ў вывучэнні гісторыі Беларусі 1941–1944 гг.

З'яўленне найноўшых прац, у тым ліку наватарскага кшталту, зробленых нямецкімі даследчыкамі на падставе выкарыстання шырокай дакументальнай базы, дазваляе аўтару гэтых радкоў выказаць тэзіс аб замацаванні ў **найноўшай** германскай гістарыяграфіі асобнага кірунку навуковых даследаванняў, у якім **Беларусь у гады Другой сусветнай вайны з'яўляецца аб'ектам, тэмай новых грунтоўных распрацовак і даследчыцкіх праектаў у германскай гістарычнай навуцы. Дзякуючы гэтаму, у парадку дня найноўшай беларускай гістарыяграфіі акрэслена актуальная задача па ўсебаковым асэнсаванні навуковых вынікаў, высноў і адкрыццяў, атрыманых у апошнія гады германскай ваеннай гістарыяграфіяй.** Паводле ацэнкі нямецкага гісторыка Б. К'яры, «*у Беларусі ад самага пачатку нямецкай акупацыі дамінантай стала вынішчэнне людзей, голад і тэрарыстычная ў сваёй сутнасці … палітыка*» [32, S. 14]. Вызначаючы месца беларускага рэгіёна ў нацысцкіх захопніцкіх планах і зыходзячы з іх ваеннага, расавага, эканамічнага і палітычнага характару, замежныя гісторыкі прыйшлі да важнай высновы, што, у параўнанні з іншымі, тэрыторыя менавіта гэтай краіны стала *ўнікальнай лабараторыяй* для ажыццяўлення найгоршай формы акупацыйнай палітыкі, расавай вайны на вынішчэнне

грамадзянскага насельніцтва, мясцовых і дэпартаваных з іншых краін яўрэяў, савецкіх ваеннапалонных, беларускіх партызан і падпольшчыкаў і г.д. У гэтай сувязі ўведзеныя ў нямецкіх манаграфічных працах новыя гістарыяграфічныя факты патрабуюць адэкватнай навуковай верыфікацыі, параўнання з працамі, ацэнкамі і высновамі беларускай ваенна-гістарычнай навукі, кампаратыўнага аналізу і пераправеркі атрыманых вынікаў. З гэтага ў пэўнай ступені вынікае актуальная патрэба ў іх навуковым асэнсаванні.

У кантэксце актуальнага пытання ў артыкуле робіцца спроба не толькі выявіць новыя дасягненні ў сучаснай германскай гістарыяграфіі, але і значна пашырыць базу гістарычных ведаў па гісторыі Беларусі 1941–1944 гг., што магчыма на прыкладзе больш дэталёвага аналізу асноўных тэндэнцый, ключавых і дыскусійных праблем і раскрыцця сучасных тэарэтычных падыходаў ў дачыненні да такога складанага феномена, як гісторыя Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Правядзенне такога аналізу патрабуе вырашэння адразу дзвюх першачарговых задач. З аднаго боку, размова ідзе пра новыя, не столькі дакументальныя, колькі гістарыяграфічныя крыніцы, якія разглядаюцца ў кантэксце навуковага аналізу актуальных замежных гістарычных распрацовак. З другога боку, у фокусе даследавання знаходзяцца навуковыя працы, якія ўтрымліваюць новыя гістарыяграфічныя факты і сучасныя навукова верагодныя вынікі для даследавання малавядомых старонак гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

У матэрыяле артыкула аўтар бачыць перад сабой вырашэнне гэтых пытанняў на прыкладзе праблемных палёў, на аснове якіх у Германіі 1990-х гадоў узнікла «*новая ваенная гісторыя*» [33, S. 397], у якой знайшоў грунтоўнае замацаванне адзін з важнейшых накірункаў вывучэння «*вайны Гітлера на ўсходзе*» [34] – **гісторыя Беларусі ў 1941–1944 гг.** Пры гэтым не ставіцца задача падрабязнага разгляду ўсёй даследаванай праблематыкі: бяруцца толькі тыя працы, якія вылучаюцца сярод іншых крыніцазнаўчай навізной і наватарствам аўтарскіх падыходаў. Зыходным лічыцца галоўны крытэрый – унесены фактычны ўклад у сучасную гістарычную навуку Германіі ў дачыненні да беларускай ваеннай праблематыкі.

Чытачу прапануюцца вынікі аўтарскага аналізу найноўшай германскай гістарыяграфіі, прадстаўленыя ў рамках: 1) раскрыцця гісторыі баявых дзеянняў летам 1941 г. і ў час вызвалення тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 гг.; 2) паказу форм усталявання германскага акупацыйнага рэжыму і выяўлення наступстваў правядзення нацысцкай палітыкі рабавання, эксплуатацыі і вынішчэння на беларускай тэрыторыі; 3) характарыстыкі гісторыі ваеннай штодзённасці мірнага насельніцтва, узброенай партызанскай барацьбы і патрыятычнага супраціўлення ў Беларусі 1941–1944 гг.

**А. Баявыя дзеянні часцей вермахта і Чырвонай арміі летам 1941 г. і падчас вызвалення тэрыторыі Беларусі ў 1943–1944 гг.**

Ставячы ў цэнтр гістарыяграфічнага аналізу працы нямецкіх гісторыкаў, прысвечаныя баявым дзеянням вермахта на тэрыторыі Беларусі летам 1941 года, а таксама ў час наступлення Чырвонай арміі ў ходзе вызвалення

беларускай тэрыторыі ў 1943–1944 гг., даследчыкі вызначылі дакладныя храналагічныя рамкі: ад фазы вядзення вермахтам наступальных баявых дзеянняў супраць часцей Чырвонай арміі ў ходзе прыгранічных баёў у раёне Беластока, Гродна, Брэста і Міиска ў першыя дні германскай агрэсіі супраць СССР да фазы абарончых баявых дзеянняў вермахта і наступлення Чырвонай арміі ў ходзе правядзення аперацыі «Баграціён», калі адбывалася адступленне германскіх войск з тэрыторыі Беларусі летам 1944 г. Такі падыход характэрны толькі для некаторых работ (Фрызер, Хартман), дзякуючы якім нямецкім гісторыкам удалося праліць дадатковы свет на некаторыя аспекты баявых дзеянняў вермахта і Чырвонай арміі. Іх даследаванні ў гэтай вобласці датычацца больш дэталёвай распрацоўкі дзейнасці толькі некаторых баявых часцей (Хартман) на першым этапе вайны, а таксама прадстаўлення франтавых баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам 1944 г. (Фрызер). У той жа час становіцца відавочным, што падрабязны разгляд баявых дзеянняў пяхотных, танкавых і паветраных часцей у вырашэнні канкрэтных баявых задач на прыкладзе лакальнага асвятлення падзей у розных раёнах Беларусі пакуль не стаў прадметам спецыяльнага даследавання, у якім нямецкія даследчыкі паказалі б розныя структуры вермахта, пачынаючы ад палявой арміі ці танкавай групы, корпуса і завяршаючы ўзроўнем дывізіі (выключэннем з'яўляецца праца Х. Хартмана), хоць менавіта гэтыя баявыя падраздзяленні выконвалі асноўныя задачы на розных рубяжах савецка-германскага фронту ў Беларусі як у пачатку, так і напрыканцы вайны. Не знайшла гэта тэма свайго ўсебаковага адлюстравання і ў дакументальнай працы Х. Ганцара, прысвечанай паказу вынікаў штурму 45-й пяхотнай дывізіяй абарончых умацаванняў Чырвонай арміі на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці летам 1941 г. [31].

Традыцыйна нямецкія гісторыкі, разглядаючы баявыя дзеянні ў першыя дні вайны, спыняюцца на агульных фактах, праліваючых дадатковае святло на ход баёў пяхотных, танкавых і кавалерыйскіх дывізій у час наступлення летам 1941 г. Бачна, што ў найноўшай германскай гістарыяграфіі пакуль адсутнічаюць спецыяльныя працы, прысвечаныя баявым дзеянням групы армій «Цэнтр» выключна на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Не падымалі гэтага пытання і папярэднія працы нямецкіх гісторыкаў, у тым ліку адзін з спецыяльных тамоў фундаментальнай 10-томнай працы, падрыхтаваны ў пачатку 1980-х гадоў Ведамствам ваенна-гістарычных даследаванняў у Фрайбургу. Фрагментарна закранае пытанні баявых дзеянняў вермахта Х. Герлах, адзначаючы той факт, што вайсковыя часці вермахта мелі перавагу перад Чырвонай арміяй ў кіраўніцтве, тактыцы, вопыце вядзення баявых дзеянняў і часткова ў тэхнічнай частцы. Гісторык дае схематычную замалёўку карціны баявых дзеянняў, паказваючы пры гэтым, што тэрыторыя Беларусі была захоплена цягам двух месяцаў у выніку: 1) бітвы ў раёне Беластока і Мінска і захопу Заходняй Беларусі ў чэрвені 1941 г.; 2) пераадолення немцамі ракі Днепр, бітвы пад Смаленскам і захопу Усходняй Беларусі, а таксама пераходу групы армій «Цэнтр» да абароны ў сярэдзіне

ліпеня; 3) заваёвы паўднёва-ўсходняй часткі Беларусі ў выніку бітваў за Гомель і Чарнігаў у другой палове жніўня 1941 г. Кажучы пра пераход да абароны германскага вермахта на цэнтральным напрамку наступлення на Маскву, аўтар прыводзіць у якасці галоўнай прычыны не ўпартую дзейнасць часцей Чырвонай арміі на дняпроўскім рубяжы ў раёне Жлобіна, Рагачова і Гомеля, а «вымушаную тэхнічную і гаспадарчую неабходнасць» [10, S. 131]. У ходзе разгляду асноўных падзей Х. Герлах звяртае ўвагу на наступствы баявых паражэнняў Чырвонай арміі, вызначаючы іх драматызм маштабамі палону чырвонаармейцаў, колькасцю амаль у 400 000 чалавек, якія трапілі ў нямецкі палон у ходзе прыгранічных баёў і баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў летнія месяцы 1941 г. Наступныя два гады, літаральна да чэрвеня 1944 г., пазіцыйныя баявыя дзеянні вяліся толькі на паўночным-усходзе ад Віцебска, куды вермахт быў вымушаны адступіць у выніку контрнаступлення Чырвонай арміі пад Масквой у снежні 1941 г. Вызваленне Беларусі, як адзначае аўтар, пачалося пасля бітвы на Курскай дузе і было звязана з першымі баявымі аперацыямі па вызваленні ўсходніх беларускіх тэрыторый.

Толькі ў працах мюнхенскага гісторыка Х. Хартмана баявыя дзеянні 4-й танкавай, 45-й пяхотнай і 221-й ахоўнай дывізій знаходзяцца ў цэнтры ўвагі. Аўтар паказвае германскі вермахт, раскрываючы ход яго баявых дзеянняў ў 1941/42 г. на прыкладзе дзвюх франтавых часцей і аднаго падраздзялення тылавой службы. Даючы апісанне асобных падзей, аўтар знаёміць чытача з тымі задачамі, вырашэнне якіх забяспечвалі гэтыя вайсковыя часці групы армій «Цэнтр» у сферы сваёй дзейнасці на тэрыторыі Беларусі. Шлях танкавай дывізіі пралягаў праз Кобрын (23.06), Баранавічы (26.06), Старыя Дарогі (29.06), Прапойск (14.07) і Крычаў (17.07). Аўтар адзначае, што ў выніку бітвы за Смаленск, якая адбывалася ў стратэгічным трохкутніку Орша – Смаленск – Віцебск, у нямецкі палон патрапілі амаль 350 тысяч чырвонаармейцаў [20, S. 255]. Аб упартых і кровапралітных баях, якія ў ходзе нямецкага штурму Брэсцкай крэпасці вялі яе абаронцы на рубяжы наступлення 45-й пяхотнай дывізіі вермахта, гаворыцца даволі схематычна. Пры гэтым аўтар адзначае, што ў вайсковым плане штурм крэпасці меў даволі нязначнае значэнне. Нямецкі ваенны гісторык паказвае, што масавыя расстрэлы мясцовых яўрэяў, праведзеныя ў пачатку ліпеня 307-м паліцэйскім батальёнам, адбываліся без удзелу часцей 45-й дывізіі, якая у пачатку ліпеня пакінула горад і знаходзілася ў раёне Пінска [20, S. 264].

Калі Хартман толькі закранае асобныя аспекты гісторыі абароны Брэсцкай крэпасці, то другі нямецкі даследчык Х. Ганцар ставіць у цэнтр сваіх шматгадовых пошукаў і шматлікіх навуковых прац, даступных айчыннаму чытачу [31], тыя гістарычныя падзеі, якія мелі месца на тэрыторыі самой крэпасці ў ходзе вядзення баявых дзеянняў і ў першыя тыдні пасля захопу горада, дзе пачалося ўсталяванне «новага парадку» і правядзенне першых мерапрыемстваў у рамках германскай акупацыйнай палітыкі, у тым ліку ў дачыненні не толькі да савецкіх ваеннапалонных, якія патрапілі у нямецкі палон на тэрыторыі крэпасці і ў ваколіцах горада Брэста,

але і да мірнага насельніцтва горада, у тым ліку і яўрэяў. Вывучэнне баявых дзеянняў на тэрыторыі крэпасці ў чэрвені 1941 г. прывялі аўтара да важных высноў. Адной з іх з'яўляецца тэзіс аб тым, што найбольшая колькасць нямецкіх салдат (ад 70 да 86 %), загінуўшых ці параненых у баях за крэпасць, прыйшлася на першыя тры дні баявых дзеянняў, што сведчыць аб іх цяжкасці. На працягу наступных двух дзён заставаліся асобныя ачагі супраціўлення, а пазней баявыя дзеянні вяліся толькі за Усходні форт, канчаткова захоплены пасля бамбардзіроўкі нямецкай авіяцыяй 29 чэрвеня 1941 г. Не менш важнай высновай можна лічыць тэзіс аб тым, што асноўныя сілы 45-й пяхотнай дывізіі, якая з раніцы 22 чэрвеня пачала штурм умацаванняў Брэсцкай крэпасці, пакінулі яе 2 ліпеня, паколькі асобныя абаронцы, якія яшчэ знаходзіліся на тэрыторыі крэпасці, не ўяўлялі баявой небяспекі. Цікавай нам здаецца і думка нямецкага аўтара пра тое, што фактычна з першых дзён германскай акупацыі ўсталёўвалася ўзаемадзеянне паміж армейскімі часцямі вермахта і паліцэйскай службай бяспекі (СД) з мэтай выканання загадаў аб знішчэнні палітычных камісараў, мясцовага яўрэйскага насельніцтва і палонных чырвонаармейцаў.

Пытанні тылавога забеспячэння вермахта Х. Хартман раскрывае на прыкладзе 221-й ахоўнай дывізіі, якая павінна была пасля адыходу баявых часцей не толькі ўстанавіць кіраванне на занятай усходняй тэрыторыі, але і забяспечыць функцыянаванне аператыўнай сувязі, чыгуначных і шасэйных дарог, наладзіць харчовае забеспячэнне. Згаданая ахоўная дывізія паступова вырашала гэтыя задачы, пры падтрымцы мясцовых камендатур, двума будаўнічымі батальёнамі, трыма батальёнамі дастаўкі, двума армейскімі зборнымі пунктамі і адным прахадным лагерам для ваеннапалонных, трыма ротамі пастаўкі боезапасаў і паліва і інш., пашыраючы ў 1941 г. сваю дзейнасць на раёны Беластока (ліпень), Баранавіч (верасень), Бабруйск (верасень), Крычаў (кастрычнік), Бранск (лістапад).

Падрабязныя звесткі аб галоўных кіруючых інстанцыях, якія забяспечвалі функцыянаванне розных службаў вермахта на акупаванай тэрыторыі, утрымлівае праца Д. Поля [19], які, у параўнанні з ацэнкамі Х. Герлаха, дае больш дэталёвае апісанне функцый «ваеннага кіраўніцтва», якое ўключала розныя падраздзяленні, што павінны былі забяспечваць тыл. Аўтар адзначае, што пасля заканчэння баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. тут былі дакладна вызначаны раёны дзейнасці ахоўных дывізій, улада якіх разам з палявымі і мясцовымі камендатурамі была ўсталявана на большай частцы Усходняй Беларусі. Апрача гэтых службаў тылавая зона з першых дзён акупацыі трапляла ў фокус дзейнасці гаспадарчых каманд «Эканамічнага штаба "Усход"» [19, S. 107].

Факты такога ўзаемадзеяння толькі ў апошні час атрымалі грунтоўнае навуковае вывучэнне ў працы Арнольда, які выявіў шэраг прычын радыкалізацыі вайны, галоўнай сярод якіх была няўдача германскага вермахта на ўсходнім фронце. Цярпела крах маланкавая вайна супраць СССР. Як сцвярджае аўтар, пры правядзенні акупацыйнай палітыкі ў першыя месяцы

вайны выкарыстоўваліся крайне радыкальныя сродкі для яе ажыццяўлення вермахтам і яго markнымі падраздзяленнямі, у тым ліку часці СС і паліцыі. У яго даследаванні такое супрацоўніцтва разглядаецца скрозь прызму палітыкі радыкалізацыі, якая фактычна з першых дзён германскай агрэсіі стала фактам дзейнасці баявых армейскіх часцей вермахта як у час наступлення, так і асабліва пасля першых няўдач плана маланкавай вайны Гітлера, што знаходзіла працяг у зоне тылу, дзе дзейнічалі франтавыя і тылавыя падраздзяленні вермахта на тэрыторыі Беларусі летам і ўвосень 1941 г.

Даволі важным дадаткам да гэтага можна лічыць абагульненыя звесткі, упершыню ўведзеныя Х. Герлахам у дачыненні да характарыстыкі германскіх ахоўных дывізій, падраздзяленняў СС і паліцыі. Іх галоўнай задачай значылася ўсталяванне абсалютнага кантролю над насельніцтвам акупіраваных тэрыторый. Паводле дакументаў, паколькі згаданымі сіламі забяспечыць такі кантроль было немагчыма, вышэйшае нямецкае кіраўніцтва выказала намер увесці «тактыку жахлівай жорсткасці» [10, S. 214]. Асаблівай каштоўнасцю даследавання нямецкага аўтара можна лічыць той факт, што ў працы ўпершыню прыведзена агульная лічба акупацыйных войскаў, падраздзяленняў СС, германскай і мясцовай паліцыі, якая дасягала крыху больш за 112 тысяч. Апроч іх у якасці добраахвотнікаў удзельнічалі фарміраванні іншых краін, у тым ліку іспанская «Блакітная дывізія» (пешым маршам толькі праходзіла праз Беларусь. – *С. Н.*), французскі пяхотны полк (французскі легіён), часці 8-й італьянскай арміі, два славацкія пяхотныя палкі і 8-я венгерская армія. Гісторык прыходзіць да высновы, што гэта ніякім чынам не магло зменшыць істотны недахоп немцаў у сілах бяспекі на тэрыторыі акупаванай Беларусі [10, S. 217]. Згаданыя фарміраванні разам з рознымі нямецкімі службамі павінны былі забяспечваць сістэму кантролю і рэгламентацыі, што магло б гарантаваць дасягненне запланаваных мэтаў акупантаў на захопленай тэрыторыі Беларусі і эксплуатацыю яе прыродных, вытворчых і людскіх рэсурсаў.

У апошнім выпадку гэтага не аднясеш да завяршальнай фазы баявых дзеянняў вермахта, франтавыя часці якога з зімы 1942 г. ажыццяўлялі тылавое забеспячэнне на поўначы Беларусі, а з восені 1943 г. вялі баі пры адступленні з захопленай савецкай тэрыторыі. Крах групы армій «Цэнтр» стаў вынікам правядзення стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён», паспяхова ажыццёўленай на тэрыторыі Беларусі летам 1944 г. У грунтоўнай працы «Вайна на ўсходзе ў 1943/44 гг.», падрыхтаванай калектывам аўтараў у рамках распрацоўкі шматтомнай гісторыі «Германскі рэйх і Другая сусветная вайна», гэту праблему спецыяльна даследуе нямецкі ваенны гісторык палкоўнік К.-Х. Фрызер, які прааналізаваў шэраг дакументальных крыніц, у тым ліку савецкага паходжання, і падрабязна раскрыў аператыўна-тактычныя дзеянні часцей вермахта падчас яго разгрому на беларускай тэрыторыі летам 1944 г. [17, S. 217].

Гістарыяграфічны аналіз нямецкіх прац, праведзены ў апошні час у беларускай гістарычнай навуцы аб баявых дзеяннях часцей вермахта і Чырвонай арміі на тэрыторыі Беларусі, пераканаўча сведчыць пра тое, што на цяперашні час адсутнічаюць спецыяльныя навуковыя даследаванні аб ходзе баявых дзеянняў за часам нямецкага наступлення і савецкай абароны, аб іх аператыўным, тактычным і стратэгічным разгортванні, вызначэнні асноўных фактараў, паказу аб'ектыўных абставін ці суб'ектыўных прычын для разумення станоўчых ці адмоўных вынікаў такіх дзеянняў паміж часцямі германскага вермахта і Чырвонай арміі на беларускай зямлі. Пры правядзенні сінхроннага аналізу баявых дзеянняў зыходзяць з аналізу дакументаў абодвух бакоў, памятаючы, што нельга зрабіць абагульнены вывад не ўлічваючы таго, што мела месца на аператыўна-тактычным узроўні з паказам канкрэтных даных аб панесеных стратах на ўзроўні батальёнаў, палкоў, дывізій, карпусоў і г.д. Першая спроба ў гэтым плане зроблена ў беларускай гістарычнай навуцы аўтарам гэтага артыкула [36], які на аснове выкарыстання метаду гістарыяграфічнай і крыніцазнаўчай кампаратывістыкі прыйшоў да важнай высновы аб неабходнасці далейшага правядзення даследаванняў па такой праблематыцы на аснове параўнаўчага разгляду крыніц нямецкага і беларускага паходжання. Такі падыход прывёў да новых ацэнак і высноў, без якіх нельга далей вывучаць гісторыю баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі.

**Б. Германскі акупацыйны рэжым, нацысцкая палітыка эксплуатацыі, рабавання і вынішчэння насельніцтва Беларусі ў 1941–1944 гг.**

Нагадаем, што толькі з моманту з'яўлення ў сярэдзіне 1980-х гадоў працы нямецкіх гісторыкаў Г. Краўсніка і Г.-Г. Вільхельма ў нямецкамоўным дыскурсе замацоўваецца іншы погляд на галоўныя падзеі «вайны Гітлера на ўсходзе». Аснову яго ўпершыню складала даследаванне злачынстваў нямецкіх акупантаў ў дачыненні да мірнага насельніцтва на захопленай савецкай тэрыторыі, у тым ліку на тэрыторыі акупаванай Беларусі. Толькі пасля гэтага такой праблематыцы пачалі прысвячаць грунтоўныя даследаванні, у якіх раскрывалі наступствы нацысцкага генацыду ў дачыненне да грамадзянскага насельніцтва краін Еўропы, у тым ліку яўрэяў. Аднак на той момант хвалюючая праблематыка трапляла на старонкі прац больш фрагментарна, часта ў кантэксце даследавання іншых падзей, таму заставалася па-за межамі сістэматызаваных даследаванняў германскай гістарыяграфіі.

Новы этап у ёй пачынаецца ў сярэдзіне 1990-х гадоў, калі на аснове ўвядзення ў навуковы зварот вялікай колькасці новых дакументальных матэрыялаў, у тым ліку з былых савецкіх архіваў, нямецкі даследчык П. Коль, гісторыкі Б. К'яры і Х. Герлах падрыхтавалі першыя дакументальныя зборы і грунтоўныя манаграфічныя працы, у аснове якіх гісторыя нацысцкай акупацыі 1941–1944 гг., палітыка рабавання, эксплуатацыі, вынішчэння мясцовага насельніцтва, супраціўлення захопнікам і супрацоўніцтва з імі (калабарацыя) ў Беларусі. Варта адзначыць, што нямецкія даследчыкі выключна свядома бачылі патрэбу ў грунтоўным вылучэнні якраз гэтага ўсходнееўрапейскага рэгіёна ў якасці аб'екта сваіх даследаванняў, які да таго

часу заставаўся невядомым для большасці прафесійных нямецкіх даследчыкаў, не кажучы пра шырокую чытацкую аўдыторыю. Таму была распачата распрацоўка малавядомых і недаследаваных на той час праблем гісторыі штодзённасці, дзякуючы чаму адбылася змена даследчых перспектыў з вывучэння дзейнасці германскіх дзяржаўных інстытуцый на ўсебаковае вывучэнне лёсу ахвяр акупацыі, вайны, пераследу і Халакосту. Тым самым закладвалася новая канцэптуальная аснова па іх усебаковым вывучэнні гістарычнай навукай аб'яднанай Германіі.

Такім чынам, у германскай навуковай гістарыяграфіі назіралася замацаванне асобнага кірунку па вывучэнні гісторыі германскай акупацыі Беларусі. Тым самым працамі П. Коля, Б. К'яры і Х. Герлаха, якія пабачылі свет у 90-я гады, былі закладзены першыя цагліны ў падмурак фарміравання новай культуры пазнання і грунтоўнага даследавання гісторыі нацысцкай акупацыі Беларусі. Навуковыя падыходы і вынікі, якія былі дасягнуты нямецкімі даследчыкамі, захоўваюць сваю актуальнасць па цяперашні час і з'яўляюцца характэрнай прыкметай замежных даследаванняў, сведчаць аб новым кірунку гістарызацыі германскай акупацыі на прыкладзе Беларусі. Адной з важных прыкмет нямецкіх прац можна лічыць выкарыстанне пашыранай базы крыніц, у тым ліку з замежных архіўных фондаў. Да прац такога кшталту адносяцца, напрыклад, даследаванні А. Бракеля, С. Бурмістр, Х. Герлаха, С. Ленстэдта, Б. К'яры, П. Коля, Б. Квінкерт, Б. Мусяла, Д. Поля, П. Рэнтрап, К.-Х. Фрызера і інш.

Практычна ўсе нямецкія гісторыкі ставяць у цэнтр увагі галоўную тэму – германскі акупацыйны рэжым на захопленых беларускіх землях, раскрываючы розныя яго аспекты. Так, на думку Герлаха, «*ні адну краіну Другая сусветнай вайна ў такіх праяўленнях, як смерць і вынішчэнне не закранула так моцна, як Беларусь*» [10, S. 11], паколькі менавіта на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў значнай меры масавымі ахвярамі сталі савецкія ваеннапалонныя, яўрэі і мясцовыя сяляне, знішчаныя ў ходзе правядзення акупантамі карных акцый супраць беларускіх партызан і грамадзянскага насельніцтва. Нацысцкі акупацыйны рэжым паказаны ў даследаваннях на розных прыкладах: ад дзейнасці ваеннай адміністрацыі, германскіх гаспадарчых службаў і органаў грамадзянскага кіравання, апарата СС і паліцыі, мясцовых органаў кіравання і паліцэйскай калабарацыі да разгляду наступстваў правядзення эканамічнай палітыкі і палітыкі вынішчэння на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Пры гэтым нямецкія аўтары спрабуюць паказаць паміж імі тую прамую сувязь, якая вынікала з нацысцкіх злачынных планаў ад захопніцкай стратэгіі Германіі на Ўсходзе. Адна з важных ідэй, якая вынікае з працы Х. Герлаха, заключаецца ў тым, што практычна кожная германская служба – розныя інстытуцыі, вайсковыя і грамадзянскія органы ўлады, у тым ліку вермахт, паліцыя, службы СС і мясцовай калабарацыі – бачылі ў аснове правядзення акупацыйнай палітыкі ідэю забойстваў.

Не менш важнай нам бачыцца і іншая думка, якую Х. Герлах прапануе ў якасці вызначальнай пры аналізе злачынных наступстваў германскіх акупантаў на тэрыторыі Беларусі. Апроч уліку вырашэння злачыннай расавай

ідэі, ён прапануе вывучаць трагічныя наступствы германскай акупацыі зыходзячы і з эканамічнага фактара, паколькі вермахт павінен быў весці вайну на Ўсходзе, забяспечваючы сябе сельскагаспадарчымі прадуктамі з рэсурсаў захопленых тэрыторый. Для вырашэння гэтай задачы германскія вайсковыя часці з першых дзень акупацыі кіраваліся дырэктывамі «Зялёнай папкі», паводле якой адказнасць за вырашэнне пастаўленых вышэй задач неслі спецыяльныя падраздзяленні «Эканамічнага штаба "Усход"» з эканамічнай інспекцыяй «Цэнтр» і гаспадарчымі камандамі. Аўтар паказвае, што для вырашэння задач забеспячэння на тэрыторыі Беларусі пачаў дзейнасць спецыяльны апарат эксплуатацыі і нарыхтоўкі. Для вырашэнне актуальных праблем у сферы сельскагаспадарчай вытворчасці шукаліся магчымасці для яе інтэнсіфікацыі, у тым ліку праводзілася новая аграрная рэформа, рабіліся захады па павышэнні вытворчасці сельскай гаспадаркі шляхам выкарыстання былых саўгасных гаспадарак і машынна-трактарных станцый. Ва ўмовах, калі працяг вайны патрабаваў ад кіраўніцтва рэйха татальнай мабілізацыі ўласных працоўных рэсурсаў, адным з галоўных становіцца «*вытворчы фактар чалавека*» [10, S. 329]. Вырашэнне ва ўмовах вайны неадкладных эканамічных задач на акупаванай тэрыторыі Беларусі патрабавала ад акупацыйных уладаў максімальна поўнага прыцягнення мясцовай рабочай сілы. На пачатковай фазе вырашэння гэтых пытанняў нямецкія службы сутыкнуліся з недастатковай прапановай рабочых рук, асабліва кваліфікаванай рабочай сілы. Гэта праблема асабліва абвастрылася з пачатку 1942 г., калі на акупаванай тэрыторыі пачалі актыўную дзейнасць спецыяльныя службы па вярбоўцы і вывазу рабочай сілы на работы ў рэйх. У такіх умовах германскім акупантам неабходна было выкарыстоўваць спецыяльныя метады па выяўленні рабочай сілы ў гарадах і яе прыцягненні з сельскай гаспадаркі, практыкавалася прымусовае ўтрыманне рабочых у спецыяльных лагерах.

У аснове разгляду германскай палітыкі вынішчэння ў Беларусі 1941–1944 гг. ляжаць дакументальныя матэрыялы, з якіх вынікае гісторыя забойстваў беларускіх яўрэяў, савецкіх ваеннапалонных і мясцовых жыхароў. Аўтар раскрывае характар правядзення карнай акцыі кавалерыйскай брыгадай СС на беларускім Палессі ў жніўні 1941 г., калі ўпершыню ішла апрабацыя новых форм масавага знішчэння беларускіх яўрэяў розных узростаў, у тым ліку жанчын і дзяцей. У працы фарміруецца храналогія такіх забойстваў, якія мелі месца на ўсёй тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ідзе размова пра ліквідацыю вялікіх яўрэйскіх абшчын ва ўсходняй частцы акупаванай Беларусі, паказваецца дынаміка скарачэння яўрэяў на тэрыторыі генеральнага камісарыята «Беларусь». Асобнае месца ў працы займае пытанне аб гісторыі жыцця і смерці яўрэяў ва ўмовах стварэння гета. Аўтар раскрывае асноўныя этапы дэпартацыі ў Мінск і яго ваколіцы нямецкіх, аўстрыйскіх і чэшскіх яўрэяў. Аб пашырэнні інфраструктуры забойстваў шляхам выкарыстання для гэтага спецыяльных аўтамабіляў (душагубак) і стварэння лагераў смерці вядзецца размова нямецкім даследчыкам. Ён спыняецца на гісторыі канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання на акупаванай тэры-

торыі Беларусі на працягу 1942–43 гг., калі завяршылася поўнае знішчэнне яўрэяў у тылавой зоне групы армій «Цэнтр», на тэрыторыі генеральных камісарыятаў «Беларусь», «Валынь – Падолія», акругі Беласток. У пералік праблематыкі ўключана і пытанне аб яўрэйскім супраціўленні і фактах выратавання яўрэяў шляхам уцёкаў з мясцовых гета. Па падліках нямецкага аўтара, гэта быў амаль кожны дзясяты з тых яўрэяў, хто не паспеў эвакуіравацца ў савецкі тыл летам 1941 г. Агульную лічбу ў амаль паўмільёна забітых у Беларусі яўрэяў нямецкі аўтар выводзіць не толькі з дакументальных падлікаў, а са спасылкай на існуючую на той час навуковую літаратуру [10, S. 743].

Яшчэ большыя маштабы набылі страты савецкіх ваеннапалонных, якія загінулі на беларускай зямлі на працягу германскай акупацыі. Па падліках Х. Герлаха, гэта лічба складае 700 тысяч. Пры гэтым з 3,3 млн савецкіх ваеннапалонных, якія загінулі ў гады вайны, больш 20 % – на беларускай зямлі. Менавіта Беларусь стала цэнтрам такіх масавых забойстваў. Інакш кажучы, для кожнага трэцяга савецкага ваеннапалоннага, які патрапіў у нямецкі палон у зоне дзейнасці групы армій «Цэнтр», менавіта Беларусь стала месцам гібелі. Аўтар абгрунтоўвае тэзіс аб тым, што савецкія ваеннапалонныя з'яўляліся самай вялікай групай ахвяр нацысцкіх злачынстваў не толькі на тэрыторыі акупаванай Беларусі [10, S. 858].

Важнае месца ў працы займае матэрыял, звязаны з маладаследаваным у беларускай ваеннай гістарыяграфіі пытаннем аб стратах мясцовых жыхароў, якія сталі ахвярамі нацысцкай палітыкі вынішчэння ў ходзе вядзення нямецкімі захопнікамі аперацый супраць беларускіх партызан. Аўтар раскрывае метады, якія акупанты выкарыстоўвалі ў ходзе правядзення карных акцый супраць партызан, знаёміць чытача з іх вынікамі, раскрывае ролю ў гэтым беларускіх «ахоўных вёсак», паказвае маштабы злачынстваў германскай паліцыі, СС і мясцовай паліцэйскай і вайсковай калабарацыі на прыкладзе пакінутых «мёртвых зон» шляхам суцэльнага спусташэння асобных тэрыторый Беларусі, перш за ўсе ў раёне Полацка, Віцебска, Лунінца і іниш. Па падліках аўтара, агульная колькасць мясцовага насельніцтва, знішчанага ў выніку гэтай палітыкі на тэрыторыі Беларусі, складае 345 тысяч чалавек. Х. Герлах паказвае і іншых ахвяр германскай палітыкі знішчэння, у тым ліку камуністаў, удзельнікаў гарадскога патрыятычнага падполля, прадстаўнікоў полькай інтэлігенцыі, цыган, псіхічна хворых і інвалідаў, дзяцей. Аўтар прыводзіць пераканаўчае сцвярджэнне аб тым, што для беларусаў акупацыя была звязана выключна з германскім прымусам, гвалтам і тэрорам. Пры паказе структуры масавых забойстваў у Беларусі нямецкі аўтар зыходзіў з тэзіса аб тым, што толькі яе грунтоўнае веданне дазваляе раскрыць недаступны розуму размах трагедыі беларускага народа [10, S. 1161].

Глыбокае асэнсаванне гісторыя акупацыі на тэрыторыі Беларусі знаходзіць сваё адлюстраванне ў працах іншых нямецкіх даследчыкаў, напрыклад, Арнольда, Бракеля, Квінкерт, Курылы, Поля і іншых. Вядомы нямецкі аўтар Арнольд імкнецца даць адказ на пытанні аб прычынах змены метадаў

ваеннага кіраўніцтва і радыкалізацыі акупацыйнай палітыкі на ўсходзе на канчатковым этапе правядзення аперацыі «Барбароса». Гісторык зыходзіць з таго тэзіса, што паражэнне вермахта пад Масквой глыбока ўцягнула яго ў злачынную вайну. Ён робіць важную выснову аб тым, што акупацыйную палітыку вермахта неабходна разглядаць не ізалявана, а ў кантэксце самых розных аспектаў вайны і ваеннай паўсядзённасці, вывучаючы праявы акупацыйнай палітыкі ў розных абласцях і з улікам усіх наяўных абставін, паказваючы прыклады дзейнасці асобных часцей вермахта, паліцыі і СС, выкарыстоўваючы для гэтага адэкватныя даследчыя метады і падыходы [14, S. 89].

Нямецкі гісторык Бракель раскрывае сутнасць германскай акупацыйнай палітыкі на прыкладзе Баранавіцкай акругі, якая з'яўлялася толькі адной з 10 акруг генеральнага камісарыята «Беларусь». Аўтар разглядае падзеі акупацыі на тэрыторыі дзейнасці толькі аднаго камісарыята, звяртаючы ўвагу на знішчэнне яўрэяў у час Халакосту, высвятляючы формы стаўлення мясцовага неяўрэйскага насельніцтва да гэтай праблемы, вылучаючы з гэтага палітыку палякаў. Асаблівае месца ён удзяляе паказу формаў узаемадзеяння мясцовага насельніцтва з нямецкімі акупантамі, удзяляючы ўвагу мясцоваму кіраўніцтву на ніжэйшым узроўні, паказваючы ўдзел дапаможнай паліцыі ў злачынствах супраць яўрэяў і грамадзянскага насельніцтва, высвятляючы ролю беларускай самапомачы, беларускага корпусу самаахôвы, беларускага саюза моладзі, беларускай краёвай абароны. Бракель паказвае вынікі прыцягнення мясцовага насельніцтва да выканання працоўнай павіннасці і выкарыстанне рабочай сілы ў рэйху [21, S. 95–229].

Таксама ў цэнтры ўвагі нямецкіх даследчыкаў знаходзяцца пытанні ўзаемасувязі нацысцкай прапаганды і тэрору супраць грамадзянскага насельніцтва і партызанаў у Беларусі. На шматлікіх дакументах, у тым ліку з беларускіх і расійскіх архіўных фондаў, Б. Квінкерт дэталёва раскрывае асноўныя этапы вядзення «ментальнай вайны» супраць беларускага цывільнага насельніцтва і пры гэтым пераконвае беларускага чытача ў тым, што прапаганда і тэрор мелі прамую сувязь, пачынаючы ад правядзення работы па дэстабілізацыі сітуацыі ў самым пачатку германскай акупацыі, калі на тэрыторыі Беларусі адбываліся першыя забойствы яўрэяў і камуністаў, да масавых акцый па забойству яўрэяў, грамадзянскага насельніцтва, савецкіх ваеннапалонных. Не без нацысцкай прапаганды на акупаванай тэрыторыі вёўся пераслед «праціўнікаў» нацысцкага рэжыму, праводзіліся акцыі супраць партызан ці мясцовых грамадзян, якіх прыцягвалі да прымусовай працы на акупаванай тэрыторыі і тэрыторыі рэйха. У працы паказана, што на тэрыторыі генеральнай акругі «Беларусь» у 1943–1944 гг. нацысцкая прапаганда мела негатыўныя наступствы. Немцы не здолелі сфарміраваць у мясцовага насельніцтва станоўчага стаўлення да сябе, тым самым не змаглі перашкодзіць яго няспыннаму пераходу да партызан. Увогуле, нямецкая прапаганда ў дачыненні да грамадзянскага насельніцтва і партызан Беларусі была часткай злачыннай акупацыйнай палітыкі [22, S. 374].

У кантэксце разгляду гэтага пытання важна адзначыць, што ў нямецкай гістарыяграфіі з'яўляюцца даволі дэталёвыя даследаванні, якія паказваюць гісторыю асобных інстытуцыйных выканаўцаў, якія забяспечвалі рэалізацыю нацысцкай палітыкі ў Беларусі. Напрыклад, праз змест «Мінскай газеты» раскрываецца роля нацысцкага акупацыйнага друку ў Мінску. Чытач знойдзе для сябе адказы на шматлікія пытанні аб структуры і дзейнасці мінскага выдавецтва і друкарні, выкарыстанні розных сродкаў для пашырэння ўплыву газеты на тэрыторыі акупаванага горада і генеральнага камісарыята «Беларусь», асабліва з улікам вядзення прапагандысцкай работы ў дачыненні да яўрэяў, беларусаў, партызан і іншых груп мясцовага насельніцтва [27, S. 116–313].

У працы В. Курылы перад беларускім чытачом намалявана карціна Халакосту ў выкананні яго непасрэдных выканаўцаў – германскай паліцыі парадку, якая ўдзельнічала ў масавых забойствах яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Беларусі. Нямецкі даследчык доказвае на аснове ўнікальных дакументальных крыніц, да ліку якіх адносяцца матэрыялы судовых працэсаў над нацысцкімі злачынцамі, што паліцыя парадку дзейнічала разам з ахоўнай паліцыяй, паліцыяй бяспекі і службы бяспекі, а таксама з вайсковымі часцямі вермахта і часцямі СС. Аўтар адзначае, што падраздзяленні паліцыі парадку былі задзейнічаны ў пагроме яўрэяў у многіх беларускіх гарадах і населеных пунктах, у тым ліку ў Мінскім гета ў лістападзе 1941 г. Кажучы пра тэрыторыю Беларусі, дзе адбывалася паслядоўнае знішчэння яўрэяў, нямецкі аўтар прыводзіць колькасныя звесткі, з якіх вынікае: ў Беларусі было знішчана ад 500 да 550 тысяч яўрэяў, з якіх амаль 300 тысяч, ці 57 %, з удзелам паліцыі парадку [16, S. 866].

Такі маладаследаваны аспект германскай акупацыі, як узаемадачыненні мясцовага насельніцтва і ваеннай адміністрацыі, у тым ліку некаторых структур ваеннага кіравання, раскрывае Д. Поль, акцэнтуючы ўвагу на разглядзе вынікаў акупацыі і дзеяння ахоўных часцей вермахта, паліцыі, палявых і мясцовых камендатур, службаў эканамічнага штаба «Усход», а таксама саміх выканаўцаў злачынных загадаў і ўсталявання акупацыйнага рэжыму. Пры гэтым гісторык адзначае, што на этапе паспяховай рэалізацыі плана «Барбароса» ўсталяванне германскага акупацыйнага рэжыму адбывалася ва ўмовах эйфарыі, калі ў першыя пяць тыдняў вядзення вайны акупацыйная палітыка яшчэ праводзілася на аснове агульнавядомых дырэктыў, што патрабавала ўсталявання больш шчыльнага супрацоўніцтва паміж ваенным апаратам вермахта, СС і паліцыі. Аднак, пачынаючы са жніўня 1941 г., гвалтоўныя меры ваенна-паліцэйскай акупацыйнай адміністрацыі набываюць адзіны прынцып для мадыфікацыі палітыкі, аснову якой складалі карныя акцыі супраць «партызан», «іх памагатых» і іншых асоб, выклікаючых падазронасць у служачых ахоўных дывізій вермахта і паліцыі. На справе такое становішча прывяло да таго, што грамадзянскае насельніцтва з восені 1941 г. апынулася сярод двух франтоў, пры гэтым значная колькасць якраз мірных жыхароў стала ахвярамі нямецкай «антыпартызанскай барацьбы», маштабы злачынстваў супраць удзельнікаў такой барацьбы набылі ўстойлівую

тэндэнцыю да ўзрастання, калі жыццё мірных жыхароў на ўсходніх акупаваных тэрыторыях абясцэнілася да самага нізкага ўзроўню ва ўсёй Еўропе [20, S. 170].

Цікавыя назіранні прапануюцца беларускаму чытачу аўтарамі калектыўнай працы «Рэйхкамісарыят Остланд» [26]. У першую чаргу гэта адносіцца да гісторыі стварэння і ліквідацыі гета на тэрыторыі генеральнага камісарыята «Беларусь», дзе палітыка акупантаў па «канчатковым вырашэнні яўрэйскага пытання» мела значныя адрозненні ад таго, што праводзілася ва Украіне і ў паўднёвых раёнах СССР. Асабліва важным для беларускіх даследчыкаў гэтай тэмы з'яўляецца карта размяшчэння гета на тэрыторыі генеральнай акругі «Беларусь», дзе было створана, дзейнічала і ліквідавана больш за 90 кропак. Не меншы інтарэс выклічуць у беларускіх даследчыкаў матэрыялы аб нацысцкай моўнай палітыцы, якую на тэрыторыі Беларусі акупанты разглядалі ў якасці вызначальных прыкмет для мясцовага насельніцтва.

Сярод актуальных пытанняў, якія спрабавалі даследаваць нямецкія гісторыкі, неабходна выдзеліць гісторыю Халакосту ў самых розных праявах: ад спецыяльных прац – да параўнальных даследаванняў. У першым выпадку размова ідзе пра працу П. Рэнтрап, якая ставіла перад сабой мэту напісання практычна першай навуковай працы па гісторыі Мінскага гета і Трасцянца. Такое спалучэнне для нямецкага аўтара з'яўляецца навукова абгрунтаваным па той прычыне, што гэтыя два месцы злачынстваў знаходзіліся ў прамой сувязі на працягу першых двух гадоў акупацыі Мінска. У працы прасочваюцца асноўныя падзеі трагедыі, якая адбылася на тэрыторыі гета і за яго межамі ў ходзе паэтапнай ліквідацыі яўрэяў. Кажучы пра Малы Трасцянец – месца знішчэння яўрэяў, нямецкая даследчыца ставіць пад сумнеў факт той колькасці ахвяр, якая вынікае з даследаваных дакументаў, абмяжоўваючы колькасць лічбай, меншай за 60 тысяч чалавек [25, S. 211].

У другім выпадку нямецкі даследчык прапаноўвае параўнальны аналіз двух гета – Варшавы і Мінска, раскрываючы факты ўдзелу нямецкіх службаў вермахта, СС і паліцыі, органаў упраўлення і ўстаноў, цывільных і фольксдойчэ ў забеспячэнні нацысцкай палітыкі вынішчэння на ўсходзе. У якасці аб'ектаў для параўнання трапляюць факты акупацыйнай паўсядзённасці ў двух гета, у тым ліку гвалту супраць палякаў і беларусаў, а таксама правядзення масавага знішчэння і канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання ў Мінску і Варшаве. Пра гэтым аўтар імкнецца знайсці адказ на прынцыпова важнае пытанне аб тым, што вызначала манеры паводзін мірных людзей у гэтых двух гарадах, якія стратэгіі, паводзін і дзеянняў выбірала грамадзянскае насельніцтва ва ўмовах ваеннай паўсядзённасці, асабліва там, дзе панавалі масавыя забойствы, гвалт і тэрор [24].

Такім чынам, у апошнія 20 гадоў у Германіі былі дасягнуты значныя поспехі ў даследаванні наступстваў германскай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі 1941–1944 гг. Сярод галоўных фактараў, якія істотным чынам паўплывалі на станоўчыя вынікі нямецкіх гісторыкаў, можна назваць звужэнне тэматыкі (з акупаваных савецкіх тэрыторый да беларускага рэгіёна) і выву-

чэнне яе з улікам даследавання лакальнай спецыфікі панавання германскага акупацыйнага рэжыму, выяўлення яго праяў па тэрытарыяльным і адміністрацыйным падзеле, а таксама дзейнасці розных вайсковых і паліцэйскіх службаў, эканамічных і грамадзянскіх інстытуцый, мясцовых органаў улады і г.д. Праведзенае ў шэрагу выпадкаў даволі падрабязнае вывучэнне падзей з розных сфер жыцця акупаванага грамадства сфарміравала ўстойлівае разуменне таго факта, што гісторыя акупацыі патрабуе ўсебаковага паказу падзей, зыходзячы выключна з пункту гледжання акупантаў, а таксама ўсведамлення характару, сутнасці і маштабу падзей, датычных выжывання грамадзянскага насельніцтва ва ўмовах германскай акупацыі. Кажучы інакш, гісторыя ваеннай штодзённасці, якая ў Беларусі характарызавалася сваімі адметнасцямі, і знайшла сваё ўвасабленне ў шматлікіх працах нямецкіх гісторыкаў. Знаёмства з імі пераконвае ў тым, што цэлы шэраг даследаваных палажэнняў можна лічыць надзвычай важнымі не толькі ў рамках фарміравання праблематыкі новага напрамку, але і ўсебаковага раскрыцця гісторыі германскай акупацыі Беларусі ў 1941–1944 гг.

Новы этап характарызуецца значным пашырэннем не толькі дакументальнай базы крыніц, але і тэматыкі даследаванняў, якая да таго часу не знаходзіла адлюстравання ў беларускай гістарычнай навуцы. Разглядаючы згаданыя вышэй працы, важна адзначыць, што нямецкія даследаванні праведзены на аснове выкарыстання багатай базы дакументальных крыніц, дзякуючы чаму практычна ўпершыню з'явілася магчымасць больш паглыбленага вывучэння малавядомых і дыскусійных старонак, якія датычацца гісторыі германскай акупацыі Беларусі. З нямецкіх прац вынікае, што на парадку дня застаюцца недастаткова даследаванымі тыя з іх, якія разглядаліся па-за межамі новых падыходаў, аснову якіх складае ідэя аб комплексным разглядзе падзей, надаючы пры гэтым асаблівае значэнне не столькі ваенным, колькі эканамічных, расавым і злачынным аспектам гісторыі германскай акупацыі. Нават агульнае знаёмства з працамі нямецкіх гісторыкаў прыводзіць да думкі, што на гэтым напрамку вывучэння акупацыйнага рэжыму нямецкім гісторыкам удалося дасягнуць не толькі значных вынікаў, але і вызначыць галоўныя кірункі яго далейшага даследавання.

**В. Ваенная паўсядзённасць, партызанская вайна і іншыя моманты ўзброенага супраціўлення ў Беларусі**

Гісторыя штодзённасці распачынаецца грунтоўнай працай Б. К'яры «Паўсядзённасць за лініяй фронту» [7], з якой упершыню закладваецца новы накірунак у даследаванні германскай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі 1941–1944 гг. Спроба напісання новага сюжэта на цэласнай карціне гісторыі германскай акупацыі на прыкладзе Генеральнай акругі «Беларусь» у нямецкага аўтара ўдалася па некалькіх прычынах, сярод якіх: 1) выкарыстанне новых дакументальных крыніц не толькі з беларускіх, нямецкіх і расійскіх архіваў, але і з практычна недаступнага для айчынных гісторыкаў фонда архіва КДБ Беларусі; 2) зварот да новых метадалагічных падыходаў, сярод якіх канцэпцыі гісторыі штодзённасці і вуснай гісторыі, якія апошнім часам сталі вызначальнымі для правядзення даследаванняў заходнімі гісторыкамі,

дзякуючы чаму ў фокусе навуковых пошукаў апынуліся ахвяры вайны, пераследу і Халакосту; 3) паказ малавядомых аспектаў гісторыі акупацыі, калабарацыі і супраціўлення, грунтоўнае даследаванне якіх стала магчымым дзякуючы выяўленню асаблівасцей германскай акупацыі ў розных рэгіёнах Беларусі.

Нямецкі гісторык прапануе новае прачытанне ваенных падзей, у якім не застаюцца па-за ўвагай факты на ўзроўні асобнай вёскі, прадпрыемства, горада або пэўнай сям'і. Ва ўмовах сістэматычных забойстваў, гвалту і тэрору з боку акупантаў на парадак кожнага дня вылучалася задача па пошуку стратэгіі выжывання для кожнага асобнага чалавека, як і магчымасці выратавання шляхам уключэння ў асобныя структуры акупаванага грамадства. Аўтар паказвае структуру ваеннага грамадства у час усталявання акупацыйнай улады, дзейнасці вайсковых і цывільных устаноў, гаспадарчых структур, упаўнаважаных па справе забеспячэння чатырохгадовага плана, вайсковых частак і штабоў, апарату паліцыі і СД, а таксама мясцовых службаў падтрымкі германскага акупацыйнага рэжыму. Нямецкі гісторык звяртае ўвагу на формы супрацоўніцтва мясцовага насельніцтва з германскімі акупантамі, праявы якога сталі асабліва відавочнымі на розных узроўнях, у тым ліку ў сферы арганізацыі беларускага самакіравання (беларуская народная самапомач), увядзення новай сістэмы аграрнага парадку, фарміравання структур кантролю за грамадзянскім насельніцтвам, а таксама паліцэйскай калабарацыі. У працы паказаны трагічны лёс беларускіх яўрэяў на тэрыторыі Генеральнай акругі «Беларусь», дзе акупанты не знайшлі значнага выяўлення антысемітызму сярод мясцовага насельніцтва. Аўтар прыходзіць да высновы, што ў ходзе вайны чалавечай асобе ўсё цяжэй было захаваць нейтральнасць, яе вымушалі рабіць выбар амаль кожны дзень. На прыкладзе Заходняй Беларусі, дзе ў гады акупацыі актыўна дзейнічалі і фарміраванні польскай Арміі Краёвай, нямецкі даследчык прыходзіць да высновы аб тым, што ва ўмовах аслаблення ўлады акупантаў і пашырэння праяў гвалту і тэрору супраціўленне набывала рысы грамадзянскай вайны [7, S. 317]. Параўноўваючы усходнюю і заходнюю частку Беларусі на прадмет вызначэння ролі антысемітызму сярод мясцовага насельніцтва ў акупаваным грамадстве, гісторык сцвярджае, што ва ўсходніх раёнах БССР ён быў менш пашыраны. Не абмінае аўтар увагай і такія групы акупаванага грамадства, як дзеці і падлеткі, выхаванцы дзіцячых дамоў і прытулкаў, для большасці якіх гады акупацыі стала сапраўднай катастрофай.

Асаблівасцю першай спецыяльнай працы можна лічыць тое, што ў ёй упершыню быў закладзены падмурак для новага напрамку гістарычных даследаванняў і намалявана стракатая карціна германскай акупацыі Беларусі. Аднак аўтар паказаў яе абмежавана, толькі на частцы беларускай тэрыторыі, уключанай у склад Генеральнай акругі «Беларусь», дзе вайна разбурыла супольнасць звычайных людзей, якая з самага пачатку германскай акупацыі амаль не функцыянавала як грамадства [7, S. 317].

Асобныя аспекты гісторыі акупаванага грамадства, у тым ліку стратэгіі выжывання ва ўмовах пашырэння гвалту, забойстваў і расавай вайны на вынішчэнне, знайшлі сваё адлюстраванне ў грунтоўных працах Бракеля, Квінкерт, Поля. Іх паглыблены аналіз дае магчымасць для стварэння агульнай панарамы гісторыі германскай акупацыі ў 1941–1944 гг. У сучаснай германскай гістарыяграфіі асобнае месца пачала займаць праблематыка, звязаная з гісторыяй партызанскага супраціўлення на захопленай беларускай тэрыторыі. Нагадаем, што ў германскай гістарыяграфіі партызанская барацьба на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. знайшла адлюстраванне ў навуковым даследаванні, выкананым выключна на аснове савецкіх дакументальных і гістарыяграфічных крыніц В. Віленчыкам у Свабодным універсітэце Берліна ў 1984 г. [53, с. 141]. Аднак крытычнае даследаванне гэтай гістарычнай з’явы ў германскай гістарыяграфіі пачалося толькі ў канцы 90-х і на пачатку 2000-х гадоў, калі пабачылі свет працы Х. Герлаха, Б. Мусяла, М. Бартушкі.

Нагадаем, што грамадская і навуковая дыскусія аб наступствах вядзення палітыкі вынішчэння ў ходзе правядзення германскімі акупантамі карных акцый супраць партызан была распачата пасля таго, як у сакавіку 1995 г. шырокай грамадскасці была ўпершыню прадстаўлена выстава «Злачынствы вермахта: маштабы вынішчальнай вайны 1941–1944 гг.», асобны раздзел якой прысвячаўся «партызанскай вайне ў Беларусі» [11, S. 429–506]. З матэрыялу вынікала, што ўвядзенне ў зоне тылу групы армій «Цэнтр» мясцовага кіравання на чале з бургамістрамі мела мэтай абавязковую рэгістрацыю насельніцтва, выяўленне сярод яго небяспечных элементаў, якія лічыліся партызанамі, супраць каго праводзіліся маштабныя «калектыўныя меры», вядомыя з дакументаў як карныя акцыі. У 1943–1944 гг. агульная колькасць такіх акцый гвалту перавышала некалькі дзясяткаў, самымі вялікімі з якіх лічыліся акцыі «Свята ўраджаю», «Зімовае чарадзейства», «Шаравая маланка», «Майская непагадзь» і іншыя. Скіраваныя супраць партызан, якія дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, такія акцыі прыводзілі да вынішчэння мірнага насельніцтва [11, S. 454–456].

Тэма гісторыі «савецкага партызанскага руху ў Беларусі» застаецца прадметам вострай дыскусіі, а таксама знаходзіцца ў фокусе грамадскага інтарэсу да цяперашняга часу. Цэнтральным пытаннем дыскусіі з’яўляецца ідэя аб наступствах узброенай барацьбы «савецкіх партызан» для мірнага насельніцтва. Наколькі было эфектыўным вядзенне баявых дзеянняў партызанамі, калі на самой справе гэта абарочвалася эскалацыяй насілля і гвалту ў дачыненні да мірнага мясцовага насельніцтва, якое станавілася заложнікам і ахвярай маштабных акцый супраць партызан. Больш таго, баявыя дзеянні партызан не заўсёды прыводзілі да ўсталявання татальнага кантролю над галоўнымі стратэгічнымі аб’ектамі – чыгункай і шашой, якія функцыянавалі ў «рабочым рэжыме» і гарантавалі асноўнае забеспячэнне праз тэрыторыю Беларусі групы армій «Цэнтр» у жывой сіле, тэхніцы, узбраеннях, харчаванні і г.д. У якой ступені дзейнасць партызан уплывала на вырашэнне гэтых пытанняў ці, наадварот, прыводзіла да эскалацыі так званых зачыстак з боку

акупантаў? Гэтыя і іншыя пытанні пакуль застаюцца дыскусійнымі сярод нямецкіх гісторыкаў. У той жа час тэзіс X. Герлаха аб тым, што барацьба партызан на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца «вяршыняй еўрапейскага партызанскага руху» (10, S. 1159) прымаецца фактычна ўсімі сучаснымі нямецкімі даследчыкамі. Па яго падліках, гібель мірнага беларускага насельніцтва ў ходзе правядзення акупантамі карных акцый супраць партызан стала галоўным вынікам. Пры гэтым агульная колькасць мірнага насельніцтва, якое загінула ў час такіх акцый, складае амаль 345 тысяч чалавек, да таго ж неабходна браць на ўлік амаль 100 тысяч прадстаўнікоў іншых груп пацярпелых [10, S. 1158].

Тэму барацьбы супраць германскіх акупантаў на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці даследуе А. Бракель, які звяртае ўвагу на гісторыю ўзнікнення і станаўлення партызанскага руху ў яго пачатковай фазе, калі першыя партызанскія ўзброеныя фарміраванні да пачатку 1942 г. былі вымушаны вырашаць галоўную стратэгічную задачу выжывання, пасля вырашэння якой здолелі пачаць больш маштабную барацьбу супраць акупантаў [21, S. 288]. Аднак далейшае развіццё партызанскага руху ў гэтым рэгіёне мела свае адметныя рысы, звязаныя з разгортваннем польскай ўзброенай падпольнай барацьбы, што прывяло да абвастрэння міжэтнічнай сітуацыі на тэрыторыі акругі «Баранавічы», стала прычынай часовай летаргіі ўзброенага партызанскага руху і адмоўна паўплывала на пошук стратэгій выжывання мірнага насельніцтва ва ўмовах вядзення ўзброенай барацьбы паміж прадстаўнікамі розных этнічных груп і германскай уладай.

Апошняй тэме прысвечана асобная праца М. Бартушкі, які паставіў у цэнтр свайго даследавання ідэю аб матывах дзейнасці некаторых груп насельніцтва і высвятленні дакладнай ролі, якую яны адыгрывалі ва ўмовах германскай акупацыі Беларусі. Аўтар удакладняе навуковае азначэнне ўзброенага супраціўлення захопнікам, называючы яго «партызанскай вайной», у якой бралі ўдзел прадстаўнікі розных этнічных груп, у тым ліку беларусы, рускія, украінцы, палякі, яўрэі. У сваёй працы аўтар пераканаўча паказвае, што ўзброеныя і крывавыя канфлікты, якія сталі фактам гісторыі Беларусі перыяду германскай акупацыі, сведчаць аб існаванні праяўленняў «грамадзянскай вайны ў цяні вайны» [18, S. 176].

Крытычны аналіз гісторыі «савецкіх партызан у Беларусі» [15; 22] стаіць у цэнтры ўвагі Б. Мусяла, аўтара дзвюх прац на гэтую тэму. Галоўным крытэрыем, праз які вядзецца даследаванне гісторыі партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі, з'яўляецца высвятленне прычын існавання міфаў у дачыненні да гэтай праблематыкі. Міфы і рэальнасць – пад такім вуглом у працы разглядаюцца асноўныя этапы ўзнікнення, развіцця і баявой дзейнасці партызанскага руху. Аўтар разглядае Беларусь як «цэнтр савецкіх партызан і партызанскага руху» ў гады Другой сусветнай вайны, на справе падрымліваючы тэзіс нямецкага гісторыка X. Герлаха, які называў партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі «вяршыняй супраціву ў Еўропе». На думку Б. Мусяла, стварэнне Цэнтральнага штаба партызанскага руху ў канцы мая

1942 г. садзейнічала выпрацоўцы адзінай стратэгіі партызанскай вайны. Разглядаючы эвалюцыю разгортвання барацьбы партызан на акупаванай тэрыторыі, Мусял адзначае, што вышэйшай кропкай партызанскага руху з'явіўся 1943 г., калі пасля перамогі Чырвонай арміі ў бітве пад Курскам пачаўся масавы прыток у склад партызан мясцовага насельніцтва. У той жа час даследчык адзначае, што павелічэнне колькасці партызан ні ў якім разе не азначала адпаведнага павышэння іх баявой актыўнасці і эфектыўнасці партызанскай барацьбы на тэрыторыі Беларусі, дзе якраз у 1943 г. былі праведзены шматлікія буйныя акцыі, ахвярамі якіх у большасці сваёй станавіліся не столькі партызаны, колькі мірнае насельніцтва. Апроч таго, на падставе нямецкіх дакументаў аўтар упершыню ўводзіць у зварот звесткі, датычныя страт партызан у зоне тылу групы армій «Цэнтр» – 94 191 чалавек. Страты нямецкага боку вагаліся ў памерах ад 54 да 57 тысяч чалавек [22, S. 292].

Б. Мусял даволі падрабязна разглядае стаўленне палякаў да савецкага партызанскага руху, высвятляе асноўныя прычыны, якія прывялі да ўзнікнення варожасці і пачатку ўзброенай барацьбы паміж польскімі фарміраваннямі і савецкімі партызанамі. Аўтар прыходзіць да высновы, што в ўмовах эскалацыі польска-савецкага канфлікту, распачатага з канца красавіка 1943 г. пасля рашэння кіраўніцтва СССР спыніць дыпламатычныя адносіны з польскім урадам у эміграцыі, у раёнах Вілейкі, Ліды, Навагрудка, Баранавічаў была распачата «рэгіянальная польска-савецкая партызанская вайна» [22, S. 428]. Аўтар лічыць, што ўвогуле ад канфлікту паміж палякамі і савецкімі партызанамі выйгралі германскія акупанты. Факты ўпарта сведчаць, што беларускія партызаны заплацілі вялікую цану за ўзброеную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Пытанне аб эфектыўнасці партызанскай барацьбы ў Беларусі разглядае і Д. Поль, на думку якога, з лета 1942 г. яна становіцца фактарам, з якім мусіла лічыцца германская акупацыйная ўлада. Пасля стварэння Цэнтральнага штаба барацьба партызан набывае характар рэгулярнай. Але важнае аператыўнае значэнне баявыя дзеянні партызан набылі толькі летам 1943 г., калі пачалася «рэйкавая вайна». На думку аўтара, аб моцы партызан сведчыць і іх дапамога Чырвонай арміі ў летнім наступленні 1944 года. З пачатку 1942 г. галоўнае камандаванне вермахта стала выкарыстоўваць самы жорсткі спосаб ліквідацыі ачагоў супраціўлення: асобы, якія дапамагалі партызанам, расстрэльваліся адразу пасля допыту ці перадаваліся паліцыі бяспекі. Пачалі ўчыняцца карныя акцыі ў адносінах да мясцовых жыхароў, у тым ліку жанчын і дзяцей. Аперацыі па вынішчэнні мірнага насельніцтва ажыццяўляліся не толькі ў зоне армейскага тылу групы армій «Цэнтр», але і на тэрыторыі Генеральнага камісарыяту «Беларусь». У стаўленні да мясцовых жыхароў нічога не мянялася: іх бязлітасна расстрэльвалі, перамяшчалі ў лагеры ці вывозілі на работы ў рэйх. У ходзе барацьбы з партызанамі ўсё часцей прымянялася вайсковая сіла – як у ходзе баявых дзеянняў, так і пры «зачыстцы» асобных партызанскіх раёнаў. На думку Д. Поля,

з агульнай колькасці ахвяр сярод мясцовага насельніцтва ў зоне тылу з чэрвеня 1941 г. па чэрвень 1944 г., якая склала больш за 200 тысяч чалавек, партызан было толькі ад 20 да 30 %. Чым большае супраціўленне аказвалася акупантам, тым больш разнастайнымі і жорсткімі станавіліся сродкі яго падаўлення. Нямецкае даследаванне паказвае, што ступень жорсткасці, з якой акупанты абыходзіліся з мясцовым насельніцтвам, залежыла ад шэрага фактараў: 1) ад таго, якая група насельніцтва трапляла ў поле зроку акупантаў: яўрэі лічыліся па-за законам, камуністы таксама; да рускіх ставіліся больш жорстка, чым да ўкраінцаў і беларусаў; 2) ад рэгіянальных ці функцыянальных абставін акупацыі (партызанская зона ці зона спусташэння, гарадское ці сельскае насельніцтва); 3) ад таго, якая рэпрэсіўная структура ажыццяўляла дзеянні: апарат СС ці паліцыі. Падраздзяленні паліцыі бяспекі і асобны батальён Дзірлевангера вызначаліся значна большай жорсткасцю, чым службы ці падраздзяленні вермахта; 4) ад функцыянальных адрозненняў паміж эканамічнымі службамі, ахоўнымі і франтавымі падраздзяленнямі ўнутры самога вермахта; 5) ад суб'ектыўнай пазіцыі каманднага персаналу ў кожным канкрэтным выпадку: палявыя і мясцовыя камендатуры, камандзіры дывізій і нават рот маглі ў значнай меры самастойна вырашаць, якім чынам абыходзіцца з мясцовым насельніцтвам і ваеннапалоннымі [20, S. 283].

Такім чынам, гістарыяграфічны аналіз асноўных прац нямецкіх аўтараў па даследаванні ваеннай праблематыкі пераконвае ў тым, што за апошнюю чвэрць стагоддзя ў германскай гістарыяграфіі сталі відавочнымі тэндэнцыі трансфармацыі ваенна-гістарычнай думкі аб ваеннай паўсядзённасці, партызанскай вайне і іншых праяўленнях супраціўлення ў Беларусі 1941–1944 гг.

**Высновы**

Развіццё германскай гістарыяграфіі ваеннай гісторыі III рэйха да пачатку 1990-х гг. праходзіла ў агульным кантэксце паказу гісторыі Другой сусветнай вайны. Цэнтральнай ідэяй абагульняючых прац, якія да таго часу выйшлі ў Германіі, заставаўся тэзіс аб вядзенні гітлераўскай Германіяй маланкавай вайны супраць СССР. Як галоўны вынік, адсутнасць у нямецкіх працах па ваеннай гісторыі Беларусі ў якасці асобнага аб'екта навуковых даследаванняў германскай гістарыяграфіі. Рубяжом выхаду першай спецыяльнай працы з'явіўся 1995 г., калі ў фокус спецыяльнага навуковага даследавання патрапіла беларуская тэматыка, якая раскрывала трагічныя наступствы нацысцкай акупацыйнай палітыкі ў Беларусі 1941–1944 гг. Аднак кардынальна змянілася сітуацыя толькі ў канцы 90-х гг., калі на канкрэтных даных, выяўленых у шматлікіх архіўных дакументах, упершыню ў навуковы ўжытак былі ўведзены малавядомыя дакументальныя крыніцы і новыя гістарыяграфічныя факты аб гісторыі паўсядзённасці па-за лініяй фронту, дзе не толькі ўсталёўваўся германскі акупацыйны рэжым, але і пачала праводзіцца нацысцкая палітыка рабавання і вынішчэння, у тым ліку мірнага насельніцтва. Дзякуючы гэтаму, пачала складвацца больш дыферэнцыраваная карціна ваеннай гісторыі Беларусі, на палатне якой дамінуюць не толькі два традыцыйныя колеры – белы і чорны, але пачалі з'яўляцца

шматлікія адценні, комплекснае даследаванне якіх на новай дакументальнай і метадалагічнай аснове патрабуе далейшага крытычнага і ўсебаковага асэнсавання шырокай мазаікі беларускіх ваенна-гістарычных падзей.

У выніку праведзенай працы нямецкіх даследчыкаў быў зроблены значны ўнёсак не толькі ў назапашванне новых фактычных матэрыялаў, але і на ўключэнне іх у еўрапейскі транснацыянальны навуковы кантэкст. Дзякуючы гэтаму ў ім з'явіліся: па-першае, самастойны кірунак даследаванняў; па-другое, адбылося ўвядзенне ў навуковы зварот вялікай колькасці новых факталагічных матэрыялаў з замежных дакументальных крыніц; па-трэцяе, вызначылася асноўнае кола навуковых ацэнак у дачыненні да ваеннай праблематыкі гісторыі Беларусі 1941–1944 гг.

Аналіз германскай гістарыяграфіі прыводзіць да такіх важных высноў: вывучэнне рэгіянальнай праблематыкі на прыкладзе Беларусі пачалося са значным спазненнем у параўнанні з іншымі тэмамі Другой сусветнай вайны і гісторыі III рэйха; зварот нямецкіх даследчыкаў да рэгіянальнай праблематыкі, звязанай з усталяваннем германскага акупацыйнага рэжыму і выяўленнем фактычных маштабаў нацысцкіх злачынстваў на тэрыторыі Беларусі, садзейнічаў актыўнаму развіццю найноўшай германскай гістарыяграфіі гісторыі Беларусі; у фокус навуковых пошукаў трапляюць пытанні ваеннай паўсядзённасці. калабарацыі, Халакосту, партызанскай барацьбы і супраціўлення на акупаванай тэрыторыі і інш.

У сваёй сукупнасці нямецкія манаграфічныя даследаванні закладваюць канцэптуальную аснову, адлюстроўваюць вядучыя тэндэнцыі ў вывучэнні і развіцці найноўшай германскай гістарыяграфіі, даюць недасведчанаму чытачу магчымасць для больш глыбокага разумення эвалюцыі ваенна-гістарычных ведаў. З тэарэтыка-метадалагічнай кропкі гледжання значэнне гэтых прац заключаецца ў тым, што яны закладвалі канцэптуальныя падыходы да разумення нацысцкага акупацыйнага рэжыму і характарыстыкі яго злачынных праяў на прыкладзе аднаго з усходніх рэгіёнаў – беларускага. Тым самым упершыню забяспечвалася магчымасць для больш адэкватнай рэканструкцыі ваеннай праблематыкі на прыкладзе падзей гісторыі Беларусі.

На аснове праведзенага аналізу можна вызначыць найбольш характэрныя рысы найноўшай германскай гістарыяграфіі, у якой гісторыя Беларусі 1941–1944 гг. знайшла адлюстраванне ў 7 наступных тэзісах: 1) 22 чэрвеня 1941 г. тэрыторыя Беларусі з размешчанымі на ёй сіламі Чырвонай арміі апынулася ў цэнтры галоўнага ўдару, які наносіў германскі вермахт у рамках ажыццяўлення плана маланкавай вайны супраць СССР і распачатай з першых дзён агрэсіі ў рамках нацысцкага вынішчэння савецкіх ваеннапалонных на захопленай беларускай тэрыторыі; 2) рабаўнічыя планы Германіі па захопу «жыццёвай прасторы на ўсходзе» прывялі да тэрытарыяльнага падзелу Беларусі, на якой з 1 верасня 1941 г. усталяваліся германскія акупацыйныя структуры ўлады (ваенная, ваенна-паліцэйская і цывільная) і нямецкае мясцовае кіраванне; 3) з усталяваннем акупацыйнага рэжыму ваенна-паліцэйскія службы і кіраўніцтва гебітскамісарыятаў пры падтрымцы часцей вермахта

распачалі правядзенне расава-ідэалагічнай вайны супраць мясцовага грамадзянскага насельніцтва; 4) палітыка вынішчэння набыла на захопленай тэрыторыі Беларусі асаблівыя маштабы і праяўлялася ў генацыдзе як яўрэйскага, у тым ліку дэпартаваных з краін Еўропы яўрэяў, так і мясцовага грамадзянскага насельніцтва; 5) ідэалагічнае супрацьстаянне складала асноўную рысу паўсядзённага жыцця на акупаванай тэрыторыі, на якой разгортвалася маштабнае супраціўленне германскім захопнікам у форме партызанскай узброенай барацьбы і патрыятычнага супраціўлення; 6) асобныя праяўленні адкрытай калабарацыі і некаторыя формы супрацоўніцтва з ворагам не знайшлі шырокай падтрымкі сярод беларускага грамадзянскага насельніцтва, а ў яшчэ большай ступені абвастрылі ўнутраную міжнацыянальную сітуацыю; 7) ва ўмовах меўшых месца радыкальных змен на усходнім фронце германскі акупацыйны рэжым спрабаваў выкарыстаць мясцовыя працоўныя рэсурсы (у тым ліку ваеннапалонных) у якасці прымусовай рабочай сілы не толькі на акупаванай тэрыторыі Беларусі, але і ў самім рэйху ў якасці остарбайтараў. Заўважым, што асноўныя тэзісы, выказаныя нямецкімі даследчыкамі ў сваіх манаграфічных працах, знайшлі навуковую апрабацыю ў шырокай чытацкай аўдыторыі як Германіі, так і Беларусі [36; 37; 38; 39; 40; 41; 42; 43; 44; 45; 46; 47; 48; 49; 50]. На парадак дня ў германскай гістарыяграфіі сталі пытанні featured рознага характару: ад атрымання агульных звестак пра асобныя гістарычныя падзеі і больш дыферэнцаванага аналізу праблем з іх дэталёвым мікрааналізам. Як бачна з вышэйпрыведзенага матэрыялу, толькі некаторая праблематыка набыла ў нямецкіх працах усебаковы ахват з атрыманнем адпаведных вынікаў.

Як выяўляецца, у фокусе даследчыцкага інтарэсу нямецкіх аўтараў знаходзілася не толькі гістарычная праблематыка, якая фарміравала агульную карціну падзей вайны на беларускай тэрыторыі, але і цэлы масіў новых дакументальных матэрыялаў. З улікам гэтага ў даследаваннях нямецкіх гісторыкаў складваліся новыя тэндэнцыі па ўсебаковым вывучэнні ваеннага мінулага ў Беларусі за часам германскай акупацыі. У выніку можна казаць пра з’яўленне ў сучаснай германскай гістарыяграфіі самастойнага навуковага напрамку, для якога характэрны не толькі новыя тэарэтычныя падыходы, звязаныя з правядзеннем якасных зменаў гістарычных ведаў на аснове «камунікатыўнага звароту», але і стварэнне магчымасці для канцэптуалізацыі ваеннай гісторыі Беларусі ў якасці прадмета гістарычных даследаванняў.

Неабходна заўважыць, што ў найноўшай германскай гістарыяграфіі назіраецца актыўны пошук такіх тэарэтычных і метадалагічных падыходаў, якія садзейнічаюць фарміраванню новых гістарычных ведаў у форме паняццяў і канцэпцый, дазваляюць адэкватна ўспрымаць, разумець і ўсебакова інтэрпрэтаваць беларускае ваеннае мінулае. Важным фактам апошняга часу становіцца актыўны дыялог паміж беларускімі і нямецкімі гісторыкамі, у выніку якога ў еўрапейскай гістарыяграфічнай прасторы пачалі ствараца сумесныя навуковыя калектывы для выканання гістарычных праектаў, у тым ліку па асобных праблемах ваеннай гісторыі Беларусі 1941–1944 гг. [27; 28; 30;

31]. Далейшы працэс па ўсебаковым, поўным і аб'ектыўным даследаванні ваеннай гісторыі Беларусі шмат у чым будзе абумоўлены блізкасцю падыходаў, канцэптуальным разуменнем гістарычных праблем і канкрэтнымі даследчыцкімі інтарэсамі гісторыкаў дзвюх краін. Будучае ўзаемадзеянне можа быць дасягнута таксама шляхам збліжэння метадалогіі гістарычных даследаванняў, выкарыстання блізкага паняційнага апарату, даследчыцкага інструментарыю, аргументацыі, логікі і г.д.

У такіх умовах прынцыповае значэнне мае пастаноўка пытання аб правядзенні гістарыяграфічнага сінтэзу найноўшых нямецкіх даследаванняў, якія адлюстроўваюць вядучыя тэндэнцыі трансфармацыі ваенна-гістарычнай думкі Германіі і разглядаюцца скрозь прызму ўзаемадзеяння гісторыі і сучаснасці. На думку аднаго з вядучых нямецкіх гісторыкаў Д. Поля, сучасная гістарычная навука не можа развівацца выключна ў нацыянальным кантэксце, яна патрабуе інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва гісторыкаў ва ўсёй Еўропе [51, с. 210]. Зыходзячы з думкі вядомага беларускага гісторыка А. М. Літвіна, на парадку дня стаіць задача «*інтэгравання вынікаў замежнай гістарыяграфіі ў беларускую гістарычную навуку па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны*» [52, с. 58], што ў сваю чаргу ставіць на парадак дня правядзенне спецыяльнага аналізу, сінтэзу і параўнання новых нямецкіх напрацовак найноўшай германскай гістарыяграфіі па гісторыі Беларусі 1941–1944 гг.

Прапанаваны матэрыял неабходна разглядаць толькі як прамежкавы вынік у даследаванні здабыткаў германскай ваенна-гістарычнай навукі, комплексны аналіз якой можа стаць асновай для пастаноўкі іншых навуковых праблем, далейшае вывучэнне якіх патрабуе выкарыстання новых ведаў і найноўшых метадалагічных падыходаў. У нашым выпадку чытачу відавочна, што гісторыя Беларусі перыяду германскай акупацыі трывала знаходзіцца ў фокусе навуковых пошукаў не толькі нямецкіх гісторыкаў [53], але і даследчыкаў іншых сацыяльных дысцыплін, якія даюць магчымасць для замацавання трывалай асновы гістарычнага мінулага Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Chapoutot, J.* Die Geschichtsschreibung zum Nationalsozialismus und der *Cultural Turn* / J. Chapoutot // Vierteljahreshefte für Zeitgeschichte. – 2017. – № 2. – S. 247–257.
2. *Möller, H.* Vorwort / H. Möller // Verbrechen der Wehrmacht. Bilanz einer Debatte / Hrsg. von Christian Hartmann, Johannes Hürter und Ulrike Jureit. – München: Verlag C. H. Beck oHG, 2005. – S. 9–15.
3. *Hartmann, Ch.* Franz Halder revisited – eine Widerbegegnung nach über 20 Jahren // Halder. Generalstabchef Hitlers 1938–1942 / Christian Hartmann. 2. erweiterte und aktualisierte Auflage. – Paderborn; München; Wien; Zürich: Ferdinand Schöningh, 2010. – S. 397.

4. *Kohl, P.* „Ich wundere mich, dass ich noch lebe“ : sowjetische Augenzeugen berichten / P. Kohl. – Gütersloh: Gütersloher Verl.-Haus Mohn, 1990. – 319 S.
5. *Lehnhard, H.* „Lebensraum im Osten“. Deutsche in Belorussland 1941–44 / H. Lehnhard. – Dortmund: Service-Druck GmbH, 1991. – 312 S.
6. *Kohl, P.* Der Krieg der deutschen Wehrmacht und der Polizei. Sowjetische Überlebende berichten / P. Kohl. – Frankfurt a. M.: Fischer Verlag GmbH, 1995. – 349 S.
7. *Chiari, B.* Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weißrussland 1941–1944 / B. Chiari. – Düsseldorf: Droste, 1998. – 380 S.
8. Einsatz im „Reichskommissariat in Ostland“. Dokumente zum Völkermord im Baltikum und in Weißrussland 1941–1944 / Hrsg. von Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Jörgen Matthäus. – Berlin: Metropol, 1998. – 301 S.
9. *Gartenschläger, U.* Die Stadt Minsk während der deutschen Besatzung (1941–1944) / U. Gartenschläger. – Dortmund : IBB, 2001. – 90 S.
10. *Gerlach, Ch.* Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941–1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.
11. Vernichtungskrieg. Verbrechen der Wehrmacht. Dimensionen des Vernichtungskrieges 1941 – 1944 / Hrsg. vom Hamburger Institut für Sozialforschung. – Hamburg: Hamburger Edition, 2002. – 749 S.
12. *Kohl, P.* Das Vernichtungslager Trostenez. Augenzeugenberichte und Dokumente / P. Kohl. – Dortmund: IBB, 2003. – 112 S.
13. Die polnische Heimatarmee. Geschichte und Mythos der Armia Krajowa seit dem Zweiten Weltkrieg / hrsg. von Bernhard Chiari unter Mitarbeit von Jerzy Kochanowski. – München: Oldenbourg Verlag, 2003. – 948 S.
14. *Arnold, K. J.* Die Wehrmacht und die Besatzungspolitik in der besetzten Ostgebieten der Sowjetunion: Kriegsführung und Radikalisierung im „Unternehmen Barbarossa“ / K. J. Arnold. – Berlin: Bunker&Humbolt, 2004. – 579 S.
15. *Musial, B.* Sowjetische Partisanen 1941–1944 in Weißrussland. Innenansichten aus dem Gebiet Baranovici 1941–1944. Eine Dokumentation / B. Musial. – München: Oldenbourg Wissenschaftsverlag GmbH, 2004. – 271 S.
16. *Curilla, W.* Die deutsche Ordnungspolizei und der Holocaust im Baltikum und in Weißrussland 1941–1944 / W. Curilla. –Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2006. – 1041 S.
17. *Frieser, K.-H.* Der Zusammenbruch im Osten. Die Rückzugkämpfe seit Sommer 1944 / K.-H. Frieser // Das Deutschen Reich und der Zweite Weltkrieg. – Bd. 8; Die Ostfront 1943/44. Der Krieg im Osten und an den Nebenfronten / Hrsg. von Karl-Heinz Frieser. – München: Deutsche Verlag-Anstalt, 2007. – S. 493–622.
18. *Bartuschka, M.* Der Partisanenkrieg in Weißrussland 1941–1944. Jeder gegen Jeden? Ursprünge, Strukturen und Parteien des Konflikts / M. Bartuschka. – Saarbrücken: VDM Aktiengesellschaft Co KG. – 2008. – 176 S.
19. *Pohl, D.* Die Herrschaft der deutschen Wehrmacht. Deutsche Militärbesatzung und einheimische Bevölkerung in der Sowjetunion 1941–1944 / D. Pohl. – München : Oldenbourg Wissenschaftsverlag, GmbH, 2008. – 399 S.

20. *Hartman, Ch.* Wehrmacht im Ostkrieg. Front und militärisches Hinterland 1941/42 / Ch. Hartmann. – München: Oldenbourg Verlag, 2009. – 928 S.
21. *Brake, A.* Unter Rotem Stern und Hakenkreuz: Baranowicze 1939 bis 1944 / A. Brakel. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2009. – 426 S.
22. *Musial, B.* Sowjetische Partisanen 1941–1944. Mythos und Wirklichkeit / B. Musial. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2009. – 592 S.
23. *Quinkert, B.* Propaganda und Terror in Weißrussland 1941–1944. Die deutsche „geistige“ Kriegsführung gegen Zivilbevölkerung und Partisanen / B. Quinkert. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2009. – 420 S
24. *Lehnstaedt, S.* Okkupation im Osten. Besatzeralltag in Warschau und Minsk 1939–1944 / S. Lehnstaedt. – München: Oldenbourg, 2010. – 381 S.
25. *Rentrop, P.* Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez / P. Rentrop. – Berlin: Motropol, 2011. – 256 S.
26. Reichkommissariat Ostland. Tatort und Erinnerungsobjekt / Hrsg. durch Sebastian Khehmann gemeinsam mit Robert Bohn und Uwe Danker. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2012. – 371 S.
27. *Burmistr, S.* Die „Minsker Zeitung“. Selbst- und Fremdbildung in der nationalsozialistischen Besatzungspresse / S. Burmistr. – Berlin: Motropol, 2016. – 364 S.
28. Diskriminiert – vernichtet – vergessen. Behinderte in der Sowjetunion, unter nationalsozialistischer Besatzung und im Ostblock 1917–1991 / Hrsg. von Alexander Friedmann und Rainer Hudemann. – Stuttgart: Franz Steiner Verlag, 2016. – 563 S.
29. Vernichtungsort Malyj Trostenez. Geschichte und Erinnerung. – Berlin: IBB Dortmung, IBB Minsk, 2016. – 246 S.
30. *Kohl, P.* Der Krieg der deutschen Wehrmacht und der Polizei. Sowjetische Überlebende berichten / P. Kohl. – Frankfurt a. M.: Fischer Verlag GmbH, 2016. – 349 S.
31. Брест. Лето 1941 г. Документы. Материалы. Фотографии / авт.-сост. К. Ганцер (рук. группы) [и др.]. – Смоленск : Инбелкульт, 2016. – 723 с.
32. Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.) : зб. навук. арт. / пад рэд. А. М. Літвіна. – Мінск: Медысонт, 2010. – 216 с.
33. *К’яры, Б.* Прадмова да беларускага выдання / Б. К’яры // Штодзённасць за лініяй фронту. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941–1944 гг.); пер. з ням. Л. Баршчэўскага; нав. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск : Poland, 2005. – 390 с.
34. *Müller, R.-D.* Hitlers Krieg im Osten. 1941–1945 / R.-D. Müller, Gerd R. Ueberschaer. – Darmstadt: Wissenschaftliche Buchgesellschaft, 2000. – 451 S.
35. *Новікаў, С. Я.* Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў; 2-е выд., выпр. і дап. – Смаленск: Універсум, 2015. – 436 с.

36. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // БГА. Т. 7. Сш. 2 (13). Снежань 2000. – С. 596–602. – Рэц. на кн.: Gerlach Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941–1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.
37. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // БГА. Т. 9. Сш. 1–2 (16–17). Снежань 2002. – С. 278–286. – Рэц. на кн.: Die polnische Heimatarmee. Geschichte und Mythos der Armia Krajowa seit dem Zweiten Weltkrieg / hrsg. von Bernhard Chiari unter Mitarbeit von Jerzy Kochanowski. – München: Oldenbourg Verlag, 2003. – 948 S.
38. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // БГА. Т. 9. Сш. 1–2 (16–17). Снежань 2002. – С. 346–350. – Рэц. на кн.: Einsatz im „Reichskommissariat in Ostland". Dokumente zum Völkermord im Baltikum und in Weißrussland 1941–1944 / hrsg. von Wolfgang Benz, Konrad Kwiet, Jörgen Matthäus. – Berlin: Metropol, 1998. – 301 S.
39. Новікаў, С. [Рэцэнзія] / С. Новікаў. Паўсядзённасць на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь (1941–1944) // Беларус. гіст. часопіс. – 2004. – № 7. – С. 76–78. – Рэц. на кн.: Chiari B. Alltag hinter der Front. Besatzung, Kollaboration und Widerstand in Weißrussland 1941–1944 / B. Chiari. – Düsseldorf: Droste, 1998. – 380 S.
40. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў. «Горад Мінск перыяду германскай акупацыі» – невядомая гістарыяграфічная крыніца // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2004. – № 3. – С. 125–129. – Рэц. на кн.: Gartenschläger U. Die Stadt Minsk während der deutschen Besatzung (1941–1944) / U. Gartenschläger. – Dortmund. IBB, 2001. – 90 S.
41. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў. Савецкія партызаны ў Беларусі: новы крыніцазнаўчы погляд // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2005. – № 4. – С. 154–162. – Рэц. на кн.: Musial B. Sowjetische Partisanen 1941–1944 in Weißrussland. Innenansichten aus dem Gebiet Baranovici 1941–1944. Eine Dokumentation / B. Musial. – München: Oldenbourg Wissenschaftsverlag GmbH, 2004. – 271 S.
42. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў. Германская акупацыйная палітыка ў Беларусі (1941–1944): погляд у святле новых крыніц // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2006. – № 5. – С. 181–189. – Рэц. на кн.: Arnold K. J. Die Wehrmacht und die Besatzungspolitik in der besetzten Ostgebieten der Sowjetunion: Kriegsführung und Radikalisierung im „Unternehmen Barbarossa" / K. J. Arnold. – Berlin: Bunker&Humbolt, 2004. – 579 S.
43. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў. Халакост і яго выканаўцы ў Беларусі 1941–1944 гг.: арыгінальны навуковы погляд // Вестн. МГЛУ. Сер. 3. История, философия, социология, экономика, культурология, политология. – 2007. – № 6. – С. 153–167. – Рэц. на кн.: Curilla W. Die deutsche Ordnungspolizei und der Holocaust im Baltikum und in Weißrussland 1941–1944 / W. Curilla. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2006. – 1041 S.

44. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2007. – № 12. – С. 67–75. – Рэц. на кн.:. Die Ostfront 1943/44. Der Krieg im Osten und an den Nebenfronten. In 10. B-de. Bd. 8 / hrsg. von Karl-Heinz Frieser. – München : Deutsche Verlag-Anstalt, 2007. – 1319 S.
45. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2010. – № 11. – С. 23–26. – Рэц. на кн.: Brakel A. Unter Rotem Stern und Hakenkreuz: Baranowicze 1939 bis 1944 / A. Brakel. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2009. – 426 S.
46. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // С. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2010. – № 11. – С. 20–23. – Рэц. на кн. : Musial B. Sowjetische Partisanen 1941–1944. Mythos und Wirklichkeit / B. Musial. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2009. – 592 S.
47. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2010. – № 11. – С. 17–20. – Рэц. на кн.: Quinkert B. Propaganda und Terror in Weißrussland 1941–1944. Die deutsche „geistige“ Kriegsführung gegen Zivilbevölkerung und Partisanen / B. Quinkert. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2009. – 420 S.
48. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2012. – № 3. – С. 25–33. – Рэц. на кн.: Rentrop P. Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez / P. Rentrop. – Berlin: Motropol, 2011. – 256 S.
49. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // Беларус. гіст. часопіс. – 2013. – № 7. – С. 15–24. – Рэц. на кн.: Reichkommissariat Ostland. Tatort und Erinnerungsobjekt / hrsg. durch Sebastian Kehmann gemeinsam mit Robert Bohn und Uwe Danker. – Paderborn: Ferdinand Schöningh, 2012. – 371 S.
50. *Новікаў, С.* [Рэцэнзія] / С. Новікаў // БГА. Т. 24. – Сш. 1–2 (2). – 2017 [Электронны рэсурс]. – 2017. – Рэжым доступу : http://www.belhistory.eu/category/2017-t-24-ssh-1-2/. – Рэц. на кн.: Burmistr S. Die „Minsker Zeitung“. Selbst- und Fremdbildung in der nationalsozialistischen Besatzungspresse / S. Burmistr. – Berlin: Motropol, 2016. – 364 S. – Рэжым доступу : 23.08.2017.
51. *Поль, Д.* Прымусовая праца ў акупаванай Усходняй Еўропе – стан нямецкай гістарыяграфіі / Д. Поль // Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.): зб. навук. артыкулаў / пад рэд. А. М. Літвіна. – Мінск: Медысонт, 2010. – С. 199–210.
52. *Літвін, А. М.* Прымусовая праца беларускіх грамадзян у святле навуковых фактаў і асабістых успамінаў сведак / А. М. Літвін // Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.) : зб. навук. артыкулаў / пад рэд. А. М. Літвіна. – Мінск: Медысонт, 2010. – С. 47–82.
53. *Новікаў, С. Я.* Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны / С. Я. Новікаў. – Мінск: МДЛУ, 2004. – 223 с.